**НА ШЛЯХУ ДА ПЕРАМОГІ**
Жанчыны БДУ падчас вайны
Стар. 2-3

**«ЖАНЧЫНА ГОДА БДУ»: ПОСПЕХ І ПРЫЗНАННЕ**
Дыялог з лаўрэаткамі пра іх працу
і жаночую ролю ў грамадстве
Стар. 4-5

**СТУДЭНТ БДУ АТРЫМАЎ ПЕРАМОГУ НА МІЖНАРОДНЫМ ЭТАПЕ «КУБКА РТК»**
Шлях да поспеху
Стар. 6

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

20 мая 2026 года, №5 (2309)

# СВЯТЛО ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ: ПАМЯЦЬ СЭРЦА І ПОДЗВІГ ПРОДКАЎ

**Напярэдадні 9 Мая ў Беларускім дзяржаўным універсітэце адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны Дню Перамогі. Галоўнай тэмай лінейкі стала непарыўная сувязь пакаленняў: ад герояў, якія змагаліся за свабоду, да моладзі, якой трэба берагчы гістарычную праўду і забяспечваць мірную будучыню краіны. Без гэтай сувязі немагчыма выхаваць грамадзяніна, які ганарыцца сваёй краінай. І менавіта ва ўніверсітэце такая сувязь набывае асаблівы сэнс: тут веды перадаюцца не толькі па падручніках, але і праз жывыя размовы, сустрэчы, агульныя памятныя акцыі.**



Кіраўнік універсітэта Андрэй Кароль падкрэсліў, што падобныя патрыятычныя сустрэчы напярэдадні найважнейшых дзяржаўных святаў набываюць велізарнае значэнне.

– *Сёння на ўрачыстым мерапрыемстве сабраліся ўжо прапраўнукі нашых вялікіх продкаў. Гэта сучаснае пакаленне беларусаў, якому ў эпоху імклівых тэхнагенных і геапалітычных выклікаў трэба будзе захоўваць і абараняць праўдзівую гісторыю краіны, яе галоўныя падзеі і памяць пра герояў. Менавіта ў пераемнасці гэтых каштоўнасцяў і галоўных сэнсаў Перамогі і заключаны гарант будучага міру, стабільнасці і развіцця Беларусі,* – абазначыў кіраўнік БДУ.

Працягваючы выступленне, Андрэй Кароль асабліва цёпла і сардэчна падзякаваў тым, хто прайшоў праз агонь Вялікай Айчыннай вайны і дажыў да нашых дзён. Ён падкрэсліў, што сённяшняе пакаленне беларусаў знаходзіцца ў неаплатным доўгу перад гэтымі людзьмі.

Акрамя таго, рэктар звярнуў увагу прысутных на сумную, але важную статыстыку: ва ўсёй краіне засталося крыху больш за пяцьсот ветэранаў. З кожным годам, падкрэсліў ён, іх становіцца менш, і гэта асабліва прыкметна на ўрачыстых сходах у БДУ, дзе яшчэ нядаўна можна было бачыць дзясяткі франтавікоў, а цяпер іх прысутнасць – вялікая рэдкасць.

Перакананне кіраўніка ўніверсітэта такое: каб трагічныя падзеі мінулага ніколі не паўтарыліся, кожнаму чалавеку сёння жыццёва неабходна памятаць, якой цаной была здабыта Перамога. Гэта азначае, што нельга забываць ні пра масавы гераізм нашых дзядоў і прадзедаў, ні пра іх бязмежную самаадданасць на палях бітваў і ў тыле. Андрэй Кароль заклікаў усіх прысутных быць шчыра ўдзячнымі за магчымасць жыць пад мірным небам, расціць дзяцей, вучыцца і працаваць без страху перад нягодамі. Толькі такая ўдзячнасць, памножаная на жывую памяць, дазваляе чалавеку ў поўнай меры раскрыць сябе – як грамадзяніна сваёй краіны, як прафесіянала ў сваёй справе і проста як асобу, здольную шанаваць галоўныя каштоўнасці жыцця.

Гонар выступіць ад імя пакалення пераможцаў выпаў Фёдару Фешчанку. Ён выказаў удзячнасць універсітэту за тое, што тут памятаюць пра студэнтаў і супрацоўнікаў ваенных гадоў, якія набліжалі Перамогу. Ветэран таксама падзяліўся ўспамінамі пра свае франтавыя будні, баявых таварышаў і іх мары пра доўгачаканае мірнае жыццё.





– *Любоў да сваёй зямлі і яе народа – гэта тая пуцяводная зорка, якая вяла салдат і простых грамадзян на няпростым шляху да Вялікай Перамогі. У тыя гады яна была здабыта страшнымі стратамі, захавана і перададзена нашаму маладому пакаленню. Цяпер ужо ў яго руках будучыня і мір Беларусі,* – са шчырасцю сказаў ветэран ВАВ.

Сімвалічна, што ў гэтым годзе да святкавання ў БДУ далучыліся дэлегаты Міжнароднага моладзевага форуму «Святло Вялікай Перамогі», прысвечанага ўкладу жанчын у перамогу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. У мерапрыемстве прынялі ўдзел больш за 200 студэнтаў з універсітэтаў Беларусі і Расіі.

Студэнты падрыхтавалі камандныя праекты пра жанчын – Герояў Савецкага Саюза. У творчай форме маладыя людзі расказалі пра лёсы сваіх суайчынніц і іх ваенныя подзвігі. Акрамя таго, удзельнікаў мерапрыемства чакаў круглы стол, прысвечаны ролі жанчыны ў Вялікай Перамозе. Спікерамі выступілі вядучыя эксперты ў галіне гісторыі БДУ.

Ад імя ўдзельнікаў форуму кранальныя словы падзякі за мірнае неба прамовіў студэнт Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта Артур Серабракоў. Ён падкрэсліў важнасць моладзевага ўзаемадзеяння ў захаванні агульнай гістарычнай спадчыны Беларусі і Расіі, а таксама расказаў пра сумесныя патрыятычныя праекты.

– *Мне прыемна адзначыць, што памяць пра нашых продкаў, якія кавалі гэту перамогу, у роўнай ступені захоўваецца ў абедзвюх краінах. У рамках форуму мы ўзгадваем нашых бабуль і прабабуль. І сапраўды, без жанчын гэтай перамогі б не было. Дзякую вам за памяць, якую мы разам захоўваем,* – завяршыў сваё выступленне Артур Серабракоў.

Урачыстая лінейка ў БДУ ў чарговы раз прадэманстравала, што памяць пра подзвіг продкаў і ўдзячнасць за падараваны мір застаюцца непахіснай асновай беларускага грамадства. Пакуль маладое пакаленне ўсведамляе сваю адказнасць за захаванне гісторыі, а ветэраны бачаць у ім сваіх пераемнікаў, у краіны ёсць трывалы падмурак для стабільнага развіцця і ўпэўненага руху наперад.

**Марыя КАРКВЕЛІС**

УНІВЕРСІТЭТ
20 мая 2026 года, №5 (2309)

# НА ШЛЯХУ ДА ПЕРАМОГІ: ЖАНЧЫНЫ БДУ ПАДЧАС ВАЙНЫ

**Вялікая Айчынная вайна падзяліла жыццё ўніверсітэцкай супольнасці на «да» і «пасля». Адмысловымі старонкамі ў летапісе БДУ сталі подзвігі яго жанчын. Кожная з іх пісала сваю гісторыю гераізму. У гэтым матэрыяле — лёсы выкладчыц, супрацоўніц і студэнтак БДУ. Іх стойкасць і вернасць Радзіме сталі сімвалам нязломнасці духу.**



***Марыя Барысаўна Осіпава***

***27.12.1908 г. – 05.02.1999 г.***

**Выпускніца Мінскага юрыдычнага інстытута, Герой Савецкага Саюза**

Нарадзілася ў сядзібе Серкавец. У 1933–1935 гг. навучалася ў Вышэйшай сельскагаспадарчай партыйнай школе імя У. І. Леніна. У 1940 г. скончыла Мінскі юрыдычны інстытут (з 1954 г. быў рэарганізаваны ў юрыдычны факультэт БДУ). У першыя дні акупацыі г. Мінска арганізавала адну з першых падпольных груп. Пасля ўсталявання сувязі з партызанамі ў жніўні 1941 г. група актыўна ўдзельнічала ў разведвальна-дыверсійнай працы. Геранчна выявіла сябе ў аперацыі «Адплата» 22 верасня 1943 г., падчас якой быў ліквідаваны генеральны камісар Генеральнай акругі Беларусь Вільгельм Кубэ. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 29 кастрычніка 1943 г. М. Б. Осіпавай было прысвоена званне Герой Савецкага Саюза з узнагароджаннем ордэнам Леніна і медалём «Залатая Зорка». Пасля вызвалення г. Мінска актыўна ўдзельнічала ў аднаўленчых працах. Займала адказныя пасады ў вышэйшых органах дзяржаўнай улады. За высокія заслугі была ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны І ступені, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.



***Вольга Дзмітрыеўна Акімава***

***01.07.1883 г. – 04.07.1969 г.***

**Педагог, выкладчык, навуковец-альголаг, дэкан біялагічнага факультэта БДУ**

Нарадзілася ў в. Туржэц Тураўлянскай воласці Полацкага павета Віцебскай губерні. Адукацыю атрымала ў Полацкім жаночым духоўным вучылішчы, Вышэйшай вольнай школе Лесгафта ў Санкт-Пецярбургу, на Вышэйшых жаночых прыродазнаўчанавуковых курсах. Пасля завяршэння навучання ажыццяўляла актыўную выкладчыцкую дзейнасць у шматлікіх навучальных установах. У верасні 1924 г. В. Д. Акімава пачала працаваць на аддзяленні прыродазнаўства педагагічнага факультэта БДУ. У 1931 г. стала дэканам створанага ў БДУ біялагічнага факультэта – першай жанчынай-дэканам у гісторыі ўніверсітэта. Затым займала пасаду дацэнта кафедры батанікі Віцебскага педагагічнага інстытута. У ліпені 1941 г. В. Д. Акімава прайшла эвакуацыю. У 1943 г. была запрошана ў якасці выкладчыка ў БДУ на ст. Сходня, дзе ўніверсітэт аднавіў працу падчас вайны. Унесла значны ўклад у развіццё адукацыйнага працэсу ў перыяд эвакуацыі. У 1943 г. была паўторна прызначана на пасаду дэкана біялагічнага факультэта БДУ. Змагла кваліфікавана арганізаваць працу па рашэнні кадравых і матэрыяльна-тэхнічных задач. У 1953 г. была ўзнагароджана ордэнам Леніна. Працягвала працу на біялагічным факультэце на пасадзе дацэнта да 1956 г.



***Марыя Парфір'еўна Баранава***

***09.10.1918 г. – 05.11.1992 г.***

**Кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі народаў СССР гістарычнага факультэта БДУ**

Нарадзілася ў г. Орша. У 1937 г. паступіла на гістарычны факультэт БДУ. У чэрвені 1941 г. прайшла эвакуацыю. У 1941–1942 гг. выкладала гісторыю ў школе в. Горкі Ірбіцкага раёна Свярдлоўскай вобласці. Затым заняла пасаду завуча і дырэктара. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны М. П. Баранава ўносіла пасільны ўклад у набліжэнне перамогі і распаўсюджанне адукацыі. У 1943 г. працягнула навучанне на ст. Сходня, дзе аднавіў працу БДУ. У 1944 г. завяршыла навучанне ва ўніверсітэце. З 1945 г. М. П. Баранава выкладала на кафедры гісторыі народаў СССР. У 1947 г. скончыла аспірантуру гістарычнага факультэта БДУ. У 1956 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю. За высокія заслугі была ўзнагароджана медалямі «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.», «Удзельніку працоўнага фронту».



***Вольга Раманаўна Скараход***

***12.07.1915 г. – 25.06.1994 г.***

**Доктар хімічных навук, прафесар кафедры аналітычнай хіміі хімічнага факультэта БДУ**

Нарадзілася ў мястэчку Брагін Рэчыцкага павета Мінскай губерні. Адукацыю атрымала ў сельскагаспадарчым тэхнікуме, затым працягнула навучанне на хімічным факультэце БДУ ў 1934–1939 гг. Пасля завяршэння навучання працавала асістэнтам на кафедры аналітычнай хіміі. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны знаходзілася ў Брагіне. У жніўні – снежні 1943 г. В. Р. Скараход была ў партызанскім атрадзе імя Р. І. Катоўскага. У 1943–1945 гг. працавала настаўнікам хіміі ў Брагінскай сярэдняй школе. Унесла вялікі ўклад у распаўсюджанне адукацыі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. У 1945 г. аднавіла працу ва ўніверсітэце і паступіла ў аспірантуру хімічнага факультэта БДУ. У 1953 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю. У перыяд правядзення даследаванняў унесла значны ўклад у развіццё метадаў хімічнага аналізу. У 1970 г. абараніла доктарскую дысертацыю. У лістападзе 1972 г. В. Р. Скараход было прысвоена званне прафесара. На кафедры аналітычнай хіміі БДУ В. Р. Скараход працягнула працу да 1986 г. За высокія заслугі была ўзнагароджана медалём «За шматгадовую плённую працу», Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.



***Валянціна Уладзіміраўна Чапко***

***25.02.1925 г. – 23.11.2004 г.***

**Доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта БДУ**

Нарадзілася ў г. Мінск. Скончыўшы школу з адзнакай у 1940 г., без экзаменаў паступіла ў Ленінградскі караблебудаўнічы інстытут на машынабудаўнічы факультэт. Напачатку Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічала ва ўзвядзенні ўмацаванняў на ўскраінах Ленінграда. У лістападзе 1941 г. падчас абстрэлу была паранена і праходзіла лячэнне ў шпіталі. У 1942 г. была разам з іншымі пацыентамі эвакуявана па Дарозе жыцця. У 1942 г. пасля лячэння пачала службу ў 914-й асобнай тэлеграфна-будаўнічай роце, дзе служыла і яе маці. Падчас службы прайшла Курск, Белгарад, Малдавію, Бесарабію, Румынію, Венгрыю, Чэхаславакію, Аўстрыю, Маньчжурыю. Пасля вяртання з фронту ў 1945–1950 гг. навучалася на гістарычным факультэце БДУ. У 1953 г. В. У. Чапко абараніла кандыдацкую дысертацыю, затым працягнула актыўную даследчую дзейнасць. У 1967 г. абараніла доктарскую дысертацыю. У 1976–1983 гг. загадвала кафедрай гісторыі БССР гістарычнага факультэта БДУ. У 1983 г. перайшла на кафедру гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў. Пасля выхаду на пенсію ў 1991 г. працягвала працу на факультэце па сумяшчальніцтве. За высокія заслугі была ўдастоена шэрагу ўзнагарод: ордэна Айчыннай вайны ІІ ступені, медалёў «За перамогу над Германіяй», «За перамогу над Японіяй», «За ўзяцце Будапешта». Навуковая і педагагічная дзейнасць В. У. Чапко была ацэнена ордэнам «Знак Пашаны», медалём «Ветэран працы».



***Ніна Георгіеўна Паўлава***

***07.01.1921 г. – 08.08.1990 г.***

**Кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі народаў СССР гістарычнага факультэта БДУ**

Нарадзілася ў в. Мокрае Жукоўскага раёна Бранскай вобласці. У 1938 г. паступіла на гістарычны факультэт БДУ. Напачатку Вялікай

Айчыннай прайшла эвакуацыю. У перыяд ваенных дзеянняў займала пасаду інспектара ў Сярэднеазіяцкай ваеннай акрузе. Затым працавала на абаронным заводзе ў г. Цюмень. Н. Г. Паўлава ўносіла пасільны ўклад у набліжэнне перамогі. У 1943 г. працягнула навучанне на ст. Сходня, дзе аднавіў працу БДУ. У 1945 г. атрымала дыплом гісторыка і паступіла ў аспірантуру. Падчас навучання Н. Г. Паўлава выкладала на кафедры гісторыі народаў СССР. У 1949–1952 гг. з'яўлялася навуковым сакратаром БДУ. Працягвала ажыццяўляць актыўную выкладчыцкую дзейнасць. У 1954 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю. За высокія дасягненні была ўзнагароджана медалём «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.».



***Зінаіда Іванаўна Завістовіч***

***1911 г. – 1944 г.***

**Аспірантка біялагічнага факультэта БДУ, удзельніца падполля г. Мінска, ахвяра лагера смерці «Трасцянец»**

Нарадзілася ў 1911 г. У 1935 г. паступіла на біялагічны факультэт БДУ. У 1940 г. з адзнакай скончыла ўніверсітэт і паступіла ў аспірантуру. З моманту пачатку Вялікай Айчыннай вайны з'яўлялася сувязной партызанскай брыгады «Дзядзька Коля». Усталёўвала сувязь з савецкімі патрыётамі і перадавала інфармацыю партызанам. Дастаўляла каштоўныя друкаваныя матэрыялы і звесткі ў партызанскую брыгаду «Дзядзька Коля». Дом, дзе пражывала сям'я З. І. Завістовіч, у 1942–1944 гг. стаў месцам збору і пераправы людзей у партызанскія атрады. Унесла значны ўклад у набліжэнне перамогі. 27 чэрвеня 1944 г. падпольшчыкі групы З. І. Завістовіч разам з ёй былі арыштаваны і накіраваны ў лагер смерці «Трасцянец». Загінула ў 1944 г.



***Аляксандра Міхайлаўна Багаслова***

**Асістэнт кафедры фізічнай геаграфіі СССР геаграфічнага факультэта БДУ, сувязная партызанскага атрада**

Нарадзілася 28 лютага 1919 г. У 1937–1941 гг. навучалася на геаграфічным факультэце БДУ. Навучанне было перапынена ў сувязі з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны. У маі 1942 г. А. М. Багаслова далучылася да 128 атрада 14 партызанскай брыгады. У 1942–1944 гг. з'яўлялася сувязной партызанскай брыгады. Пасля вызвалення БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў А. М. Багаслова працягнула навучанне і скончыла геаграфічны факультэт. У 1945 г. пачала працаваць на кафедры фізічнай геаграфіі СССР. Затым была пераведзена на кафедру геалогіі і глебазнаўства. У 1953 г. была пераведзена на пасаду асістэнта кафедры геалогіі геаграфічнага факультэта БДУ. У 1956 г. аднавіла працу на кафедры фізічнай геаграфіі СССР. Працягнула працу на геаграфічным факультэце БДУ да 1975 г. За высокія дасягненні была ўзнагароджана медалямі «За баявыя заслугі», «Дваццаць гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.», «50 гадоў Узброеных Сіл СССР», «60 гадоў Узброеных Сіл СССР», нагрудным знакам «25 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне».



***Варвара Пятроўна Вырвіч***

***15.12.1922 г. – 1998 г.***

**Выпускніца БДУ, камандзір камсамольска-моладзевага дыверсійнага партызанскага атрада імя С. М. Будзённага**

Нарадзілася ў г. Рэчыца. Адукацыю атрымлівала ў політэхнічным інстытуце. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны сышла добраахвотнікам на фронт. Заняла пасаду санітарнага інструктара, брала ўдзел у баях. Падчас вайны прайшла навучанне ў Маскве ў разведвальна-дыверсійнай спецшколе. Пасля навучання ў 1943 г. была накіравана ў распараджэнне Беларускага штаба партызанскага руху і дыслацыравалася на тэрыторыі Добрушскага і Веткаўскага раёнаў. Заняла пасаду камандзіра камсамольска-моладзевага дыверсійнага партызанскага атрада імя С. М. Будзённага. У той перыяд стала вядомай пад пазыўным «Каця». Пад яе кіраўніцтвам атрад браў удзел у шматлікіх дыверсіях і аперацыях рэйкавай вайны, аказваў дапамогу партызанам. За здачу «Каці» ворагам была прызначана высокая цана, пра што сведчаць шматлікія ўлёткі. Атрымаўшы сур'ёзныя раненні і не маючы магчымасці працягваць удзел у ваенных дзеяннях, узначаліла Добрушскі камітэт камсамола і працавала ў Гомельскім абкаме ЛКСМБ. У пасляваенныя гады атрымала юрыдычную адукацыю ў БДУ. За высокія заслугі была ўзнагароджана ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «Партызану Айчыннай вайны» I і II ступені, «За перамогу над Германіяй».



***Марыя Андрэеўна Жыдовіч***

***19.10.1906 г. – 12.11.1977 г.***

**Доктар філалагічных навук, прафесар кафедры беларускай мовы філалагічнага факультэта БДУ, дэкан філалагічнага факультэта БДУ**

Нарадзілася ў в. Дукора Ігуменскага павета Мінскай губерні. Адукацыю атрымала ў Магілёўскім педагагічным тэхнікуме, затым – у Мінскім вышэйшым педагагічным інстытуце. У 1938 г. паступіла ў аспірантуру Мінскага педагагічнага інстытута на кафедру беларускай мовы. У ліпені – жніўні 1941 г. М. А. Жыдовіч знаходзілася ў эвакуацыі. У 1943 г. пачала працу ў якасці выкладчыка беларускай мовы на ст. Сходня, дзе аднавіў працу БДУ. Унесла значны ўклад у развіццё адукацыйнага працэсу ў перыяд эвакуацыі. У 1944 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю. У 1949 г. М. А. Жыдовіч было прысвоена званне дацэнта. У сувязі з недахопам навуковых кадраў у 1946–1953 гг. М. А. Жыдовіч сумяшчала выкладанне ў БДУ з працай у АН БССР. У 1951–1952 гг. М. А. Жыдовіч заняла пасаду дэкана філалагічнага факультэта БДУ, стаўшы першай жанчынай-дэканам дадзенага факультэта. У 1954–1956 гг. навучалася ў дактарантуры Інстытута мовазнаўства АН СССР у Маскве. У 1958 г., абараніўшы доктарскую дысертацыю, стала першым у Беларусі доктарам філалагічных навук у галіне беларускага мовазнаўства. У 1960 г. было прысвоена званне прафесара. За высокія заслугі была ўзнагароджана медалямі «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне» ў 1945 г., «За працоўную доблесць» у 1960 г., Граматай Вярхоўнага Савета БССР у 1951 г., Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР у 1976 г. У 1971 г. была ўдастоена звання «Заслужаны дзеяч навукі БССР».



***Міра Бенцыянаўна Фрыдман***

***10.08.1908 г. – 28.06.1972 г.***

**Кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі народаў СССР гістарычнага факультэта БДУ**

Нарадзілася ў мястэчку Калінкавічы Мазырскага павета Мінскай губерні. У 1926–1930 гг. навучалася на сацыяльна-гістарычным аддзяленні педфака БДУ і займала пасаду лабаранта на рабфаку БДУ. Пасля навучання выкладала на кафедры марксізму-ленінізму ў г. Віцебск, з 1937 г. чытала курс «Гісторыя народаў СССР». Стала адной з першых аспірантак кафедры гісторыі народаў СССР. Напачатку Вялікай Айчыннай вайны была эвакуявана ў г. Ульянаўск, дзе выкладала ў педінстытуце. Затым заняла пасаду штатнага лектара гаркама і абкама партыі. Унесла вялікі ўклад у распаўсюджанне адукацыі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. У 1944 г. была залічана старшым выкладчыкам кафедры гісторыі народаў СССР і ажыццяўляла актыўную выкладчыцкую дзейнасць. У пасляваенныя гады абараніла кандыдацкую дысертацыю. З 1949 г. з'яўлялася дацэнтам кафедры гісторыі СССР. Выкладчыцкую працу працягвала да 1972 г. За высокія заслугі была ўзнагароджана медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.».



***Аляксандра Міхайлаўна Папова***

**Кандыдат біялагічных навук, дацэнт кафедры глебазнаўства і геалогіі геаграфічнага факультэта БДУ, метэаназіральнік 17-й паветранай арміі**

Нарадзілася 30 студзеня 1921 г. у пасёлку Міхайлаўка Міхайлаўскага раёна Валгаградскай вобласці. У 1937–1939 гг. навучалася ў Сталінградскім дзяржаўным настаўніцкім інстытуце. У 1940–1942 гг. займала пасаду настаўніка прыродазнаўства і геаграфіі ў сярэдняй школе ў Міхайлаўцы. Унесла вялікі ўклад у распаўсюджанне адукацыі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. У 1942 г. А. М. Папова пачала службу ў штабе 17-й паветранай арміі ў якасці метэаназіральніка. Удзельнічала ў ваенных дзеяннях у Балгарыі, Югаславіі, Румыніі. Пасля Вялікай Айчыннай вайны А. М. Папова заняла пасаду старшага лабаранта кафедры глебазнаўства геаграфічнага факультэта БДУ. У 1949–1952 гг. навучалася на геаграфічным факультэце БДУ. У 1957–1961 гг. з'яўлялася кіраўніком глебавага атрада, створанага пры кафедры. У 1970 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю і была пераведзена на пасаду старшага выкладчыка кафедры. Працягнула працу на геаграфічным факультэце да 1977 г. За высокія заслугі была ўзнагароджана медалямі «За абарону Сталінграда», «За баявыя заслугі».

**Па матэрыялах гістарычнага і геаграфічнага факультэтаў, архіва і музея БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
20 мая 2026 года, №5 (2309)

# «ЖАНЧЫНА ГОДА БДУ»: ПОСПЕХ І ПРЫЗНАННЕ

**Атмасфера свята панавала 16 красавіка ў Нацыянальным тэатры імя Янкі Купалы, дзе ўшаноўвалі выдатных жанчын БДУ. Прэмія, прысвечаная 105-годдзю ВНУ і Году беларускай жанчыны, стала прызнаннем заслуг прыгожай часткі калектыву перад універсітэтам і краінай. Больш чым сто жанчын атрымалі ўзнагароды ў 8 намінацыях. Мы пагутарылі з лаўрэаткамі пра іх працу і жаночую ролю ў грамадстве.**

## «ЛІДАРСТВА І КІРАВАННЕ»



*Алена Кальмакова, дэкан факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі*

Амаль 25 гадоў таму яна з адзнакай скончыла геаграфічны факультэт, працоўны стаж у БДУ – 20 гадоў. Зрабіла кар'еру ад выкладчыка да дэкана факультэта (на пасадзе з 2022 г.). За 92-гадовую гісторыю ФГГ Алена Генадзьеўна стала першай жанчынай, якая ўзначаліла падраздзяленне.

**– Якія былі цяжкасці ў новай ролі кіраўніка?**

– Мне давялося цалкам пераарыентаваць сваю дзейнасць. Праца дэкана – гэта перш за ўсё праца менеджара. Кіраваць калектывам – нялёгкая задача, якая патрабуе трымаць у галаве мноства паралельных працэсаў: развіццё кадравага патэнцыялу, арганізацыю адукацыйнага працэсу і навуковай дзейнасці, а таксама вырашэнне гаспадарчых момантаў. Поспех факультэта – поспех усяго калектыву. Мне пашанцавала мець каманду аднадумцаў, за што я ім вельмі ўдзячная.

**– Чаму вырашылі звязаць свой шлях з БДУ?**

– Абставіны склаліся самі сабой. Паступіла ў аспірантуру, хутка абараніла дысертацыю, і мне прапанавалі застацца ва ўніверсітэце. Гледзячы назад, разумею, што перадумовы да гэтага былі: я расла ў педагагічнай дынастыі. Бабуля і дзядуля былі заслужанымі настаўнікамі, сястра таксама выбрала такі шлях. Лічу, гэта прызванне. Праца з людзьмі патрабуе асаблівых кампетэнцый: не кожны зможа знайсці падыход да «вялікіх дзяцей» – студэнтаў. Я з тых шчаслівых людзей, якія займаюцца любімай справай і атрымліваюць аддачу.

Навуковыя інтарэсы – рэгіянальная фізічная геаграфія і дыдактыка вышэйшай і сярэдняй школы. За гады працы выкладала больш за 10 курсаў: ад класічнай біягеаграфіі і палеагеаграфіі да «Geoeconomics of Countries» на англійскай мове. Зараз чытаю курсы «Фізічная геаграфія мацерыкоў» і «Фізічная геаграфія свету». Апошні курс самы аб'ёмны на нашым факультэце, і чытаю яго досыць даўно.

**– Якія пераўтварэнні плануеце ўкараніць на ФГГ?**

– Факультэт, як і ўніверсітэт – перадусім не сцены, а людзі. Самае каштоўнае – кадравы патэнцыял. Менавіта таму бачу сваёй галоўнай задачай стварэнне ўмоў для прафесійнага росту маладога пакалення. Зараз мы актыўна працуем у гэтым напрамку: на факультэце навучаецца рэкордная для нас колькасць аспірантаў і дактарантаў – больш за 40 чалавек. Гэта наш адказ на праблему адсутнасці сярэдняга звяна педагогаў, якая актуальная для многіх. Нам важна вырасціць годную змену, захаваўшы пераемнасць ведаў.

Таксама ў планах – абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы. Спецыфіка нашага факультэта звязана з палявымі даследаваннямі, якія патрабуюць сучаснага абсталявання для якаснай працы.

Многія задумкі ўжо ўвасабляюцца ў жыццё. За апошнія гады адкрылі дзве новыя спецыяльнасці на бакалаўрыяце, шэсць англамоўных магістарскіх праграм. У будучыні хацелася б запусціць новую спецыяльнасць, адукацыйную праграму ў калабарацыі з замежным партнёрам. Ідэй вельмі шмат – галоўнае, каб на іх рэалізацыю хапала часу і падтрымкі аднадумцаў.

**– Дзе бераце сілы на ўсе сферы дзейнасці і як бачыце ролю сучаснай жанчыны?**

– Мабыць, самы складаны выклік сучаснасці – асабліва ў кантэксце года жанчыны – гэта ўменне ўсё паспяваць. Галоўнай праблемай становіцца дэфіцыт часу. Прычым важна не проста закрыць спіс спраў, а выканаць усё якасна: рэалізавацца ў прафесіі і пры гэтым дастаткова ўвагі надаць сям'і. Знайсці гэты баланс і захаваць высокую планку ва ўсіх сферах, бадай, самы сур'ёзны «чэлендж», з якім мне даводзіцца сутыкацца штодня. На мой погляд, сёння гендарная прыналежнасць адыходзіць на другі план. Поспех чалавека залежыць ад яго асобы, кампетэнцый. Улічваючы сучасныя трэнды, лічу, што роля жанчыны ў соцыуме будзе толькі ўзрастаць. Жанчыны атрымліваюць якасную адукацыю, яны амбіцыйныя і сацыяльна актыўныя, што непазбежна вядзе да ўзмацнення іх уплыву.

## «ВЕТЭРАН ПРАЦЫ»



*Тамара Макарава, загадчыца кафедры экалагічнага і аграрнага права юрыдычнага факультэта*

Тамара Іванаўна скончыла юрыдычны факультэт БДУ ў 1981 годзе, працуе ва ўніверсітэце з 25 сакавіка 1985 г., восьу ужо 41 год. Прайшла шлях ад лабаранта да загадчыцы кафедры. Яна прызнаецца, што ганарыцца ўзнагародай і тым, што ўніверсітэт адзначыў яе працу.

**– Як вы ацэньваеце свой шлях у БДУ?**

– Сумесна з маімі калегамі ў 1991 годзе стаяла ля вытокаў стварэння кафедры экалагічнага і аграрнага права (і дагэтуль адзінай у Беларусі), а разам з ёй навуковай школы экалагічнага, прыродарэсурснага і аграрнага права, кіраўніком якой з'яўляюся. Гады працы ва ўніверсітэце ўключаюць не толькі адукацыйны працэс, які займае першае месца ў нашай справе, але і навуковую дзейнасць з арыентацыяй на праватворчы працэс, а таксама падрыхтоўку навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі. У мяне асабіста 7 вучняў, адзін з якіх грамадзянін Казахстана.

Універсітэт вылучыў мяне на пасаду старшыні экспертнага савета па юрыдычных навуках Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь, якую я займала на працягу дзевяці гадоў (2015–2024 гг.).

Гэта мая праца, якую я сумленна выконваю, а ацэнку ёй даюць надзеленыя паўнамоцтвамі кіраўнікі ўніверсітэта.

**– Як змяніліся ўніверсітэт і студэнты за чатыры дзесяцігоддзі і што, па-вашаму, засталося нязменным у духу БДУ?**

– Цяпер з вышыні пражытых гадоў бачыш, што ўніверсітэт змяніўся кардынальна! Але адбывалася гэта паступова: другая палова 80-х гг. XX ст. – перабудова – надзеі на лепшае; пачатак 90-х – старыя сцены і парты, адсутнасць новых падручнікаў, добрых навуковых часопісаў; а з другой паловы 90-х – пад'ём і рост. Дзяржава ўклала значныя сродкі ва ўніверсітэт, і ўніверсітэцкі калектыў адказаў поўнай самааддачай. Гонар за нас, жаданне не падвесці – галоўныя стымулы добра працаваць.

Канстанта – сам дух універсітэта – той творчы і навуковы патэнцыял, які тут акумулюецца на працягу ўжо больш чым ста гадоў, прыцягвае ва ўніверсітэт таленавітых навукоўцаў і педагогаў. У гэтай атмасферы працаваць цікава і прыемна.

А вось як змяніліся студэнты? Цяпер ва ўніверсітэце вучацца равеснікі маіх унукаў. Можа, з гэтай прычыны мне здаецца, што мы ў свае студэнцкія гады былі больш сталымі...

**– Як трансфармавалася роля жанчыны ва ўніверсітэцкім асяроддзі на працягу вашай кар'еры?**

– Адбылося глыбіннае пераўтварэнне. Зараз на кіраўнічых пасадах ва ўніверсітэце працуюць дзясяткі жанчын. А я памятаю часы, калі ў кіраўніцтве юрыдычнага факультэта не было ніводнай. Цяпер нас прыкладна палова, у тым ліку наш дэкан Святлана Ананіч. Жанчыны не толькі навучаюць студэнтаў, рыхтуюць да абароны аспірантаў, плённа займаюцца навукай, але і кіруюць адукацыйным і навуковым працэсамі.

**– Што дапамагае вам захоўваць любоў да сваёй справы?**

– Камунікацыя са студэнцкай моладдзю як сапраўды невычэрпная крыніца энергіі, якая жывіць, і жаданне падзяліцца з імі ведамі літаральна ўключае разумовы працэс, які генеруе навуковыя ідэі. Бывае так: чытаеш студэнтам лекцыю, тлумачыш праблемныя аспекты, у нейкі момант разумееш шляхі іх вырашэння. На рашэнне складаных нарматворчых задач могуць нацэліць пытанні, якія задаюць студэнты.

## «ЖАНЧЫНА ПРАЦЫ»



*Таццяна Свірына, вядучы бібліятэкар аддзела аўтаматызацыі бібліятэчных працэсаў Фундаментальнай бібліятэкі БДУ*

Узнагарода стала прызнаннем яе стараннасці – каля 10 гадоў яна працуе ў аддзеле аўтаматызацыі, дзе займаецца вядзеннем Электроннай бібліятэкі. Яна кажа, што ў камфортных умовах і без лішняй мітусні справа добра ладзіцца, а апрацоўка дадзеных – гэта тое, што ёй сапраўды падабаецца.

**– З якімі задачамі сутыкнуліся ў апошні час? Дзе бераце натхненне?**

– Гэта аднаўленне тэмпу працы пасля пераезду Фундаментальнай бібліятэкі са звыклых сцен галоўнага корпуса ў новы будынак на Даўгабродскай. Мяне матывуе ўсведамленне таго, што мая дзейнасць тэхнічна ўплывае на павышэнне паказчыкаў універсітэта. У прыватнасці, гэта тычыцца цытаванасці: публікацыі аўтараў і іх індэксацыя ў РІНЦ фарміруюць асабісты рэйтынг даследчыкаў. Акрамя таго, якаснае напаўненне і правільнае афармленне Электроннай бібліятэкі – гэта прамы ўклад у рэйтынг Фундаментальнай бібліятэкі.

**– На ваша меркаванне, якая роля жанчыны ў сучасным грамадстве?**

– Быць не толькі матуляй і захавальніцай сямейных традыцый, але і актыўнай, незалежнай асобай, здольнай уплываць на будучыню грамадства.

## «НАВУКОВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ»



*Марына Гутоўская, загадчыца кафедры германскага мовазнаўства філалагічнага факультэта, старшыня пярвічнай арганізацыі РГА «Белая Русь» БДУ*

Узнагароду ўніверсітэта ўспрымае як высокую ацэнку навуковай дзейнасці і важны стымул для будучай актыўнай працы. Лічыць, што жаночая роля ў беларускай навуцы гістарычна высокая і працягвае ўзмацняцца, жанчыны складаюць вялікую частку навуковага патэнцыялу краіны.

**– Якое ваша навуковае дасягненне за апошні час вы лічыце самым прыкметным?**

– Ёсць асабістыя дасягненні – вынікі праведзеных даследаванняў дакладваюцца на прадстаўнічых міжнародных навуковых форумах, публікуюцца ў міжнародных навуковых выданнях і ўкараняюцца ў адукацыйны працэс. Ёсць студэнцкія – падрыхтаваныя пад маім кіраўніцтвам студэнцкія навуковыя працы адзначаны дыпломамі І ступені ў рэспубліканскіх конкурсах навуковых работ, кандыдацкія дысертацыі – стыпендыямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У 2025 г. за плённую навукова-педагагічную дзейнасць удастоена падзякі Прэзідэнта.

Ёсць калектыўныя – даручаная мне кафедра германскага мовазнаўства сёлета пачала распрацоўку актуальнай НДР «Магчымасці вялікіх моўных мадэляў у сучаснай лінгвістыцы: тэарэтыка-метадалагічныя і прыкладныя рашэнні» ў рамках Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Сацыяльна-эканамічная, палітычная і нацыянальна-культурная бяспека беларускай дзяржаўнасці» на 2026–2030 гг.

Але самым значным лічу ўклад у развіццё супрацоўніцтва БДУ з найбуйнейшымі цэнтрамі адукацыі і навукі Расійскай Федэрацыі: Інстытутам мовазнаўства Расійскай акадэміі навук, Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам імя М. В. Ламаносава, Маскоўскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэтам, Санкт-Пецярбургскім дзяржаўным універсітэтам. Па маёй ініцыятыве і непасрэднай рэалізацыі пры ўдзеле названых устаноў на базе БДУ праведзены маштабныя міжнародныя навуковыя канферэнцыі: «Мова, культура, творчасць у трансдысцыплінарным вымярэнні: традыцыі і інавацыі» (2021, 2025; арганізатары: БДУ, ІМ РАН, МДУ імя М. В. Ламаносава) і «Англістыка ў трэцім тысячагоддзі: новыя падыходы і шляхі развіцця» (2024; БДУ, ІМ РАН, МДЛУ), а таксама серыя навукова-метадычных семінараў «Лінгвадыдактыка вуснага перакладу» (2025; БДУ, СПбДУ). Названыя навуковыя мерапрыемствы аб'ядналі больш за 450 навукоўцаў з 12 краін.

**– Якая ваша галоўная крыніца энергіі, калі даводзіцца сумяшчаць грамадскую дзейнасць з акадэмічнай нагрузкай?**

– Напэўна, усведамленне комплекснасці місіі БДУ. Мы працуем з моладдзю, і наша задача – не толькі фарміраваць прафесійныя кампетэнцыі, але і развіваць таленты і творчыя здольнасці моладзі, далучаць да нацыянальных духоўна-маральных каштоўнасцяў. Рэалізацыя такога комплексу задач, на мой погляд, патрабуе сумяшчэння акадэмічнай і грамадскай дзейнасці.

**– Якую параду дасце студэнткам, якія толькі пачынаюць свой шлях у навуцы?**

– Знайдзіце настаўніка, які будзе зацікаўлены ў развіцці абранага навуковага напрамку і зможа спрыяць станаўленню маладога навукоўца – добры навуковы кіраўнік дапаможа пазбегнуць тыповых памылак і эфектыўна інтэгравацца ў акадэмічную супольнасць. І пачніце даследчую працу як мага раней, з 1-2 курса – ранні старт паспрыяе своечасоваму фарміраванню навукова-тэарэтычнай базы і назапашванню неабходнага вопыту для далейшых паглыбленых навуковых пошукаў.

## «ІДЭАЛАГІЧНАЯ І ВЫХАВАЎЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ»



*Алена Скакун, начальнік аддзела па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце Інстытута бізнесу БДУ*

Гэты знак адметнасці падкрэсліў яе пераканаўчы ўклад у агульную справу – 18 гадоў працы ў БДУ. На яе думку, роля жанчыны сёння шматгранная. Жанчына адначасова прафесіянал, лідар, стваральніца і захавальніца сацыяльных каштоўнасцяў.

**– Як вы развіваеце студэнцкія традыцыі і далучаеце студэнтаў да грамадскага жыцця?**

– Студэнцкае жыццё ў нашым інстытуце насычанае. Тут практычна кожны навучэнец знойдзе сабе занятак для душы. Так, напрыклад, студэнцкае самакіраванне дае магчымасць праявіць сябе. Падтрымліваючы студэнцкія ініцыятывы, мы даваем ім арганізацыю маштабных івентаў і запуск праектаў – гэта тое, што робіць маладзевае жыццё дынамічным. Нашы выпускнікі застаюцца часткай вялікай сям'і. Традыцыі ўзаемадзеяння «студэнт – выпускнік» дазваляюць навучэнцам атрымліваць ментарскую падтрымку і буст у кар'еры.

**– Як знайсці баланс паміж высокімі дысцыплінарнымі патрабаваннямі і інтарэсамі моладзі?**

– На мой погляд, гэта пераход ад мадэлі «кантролю» да мадэлі «саўдзелу». Сучаснае пакаленне шануе сэнсы, аўтаномію і псіхалагічны камфорт. Трэба захоўваць баланс паміж «трэба» і «навошта». Адметная рыса цяперашняга маладога пакалення – патрэба ў рацыянальным абгрунтаванні правілаў. Прыярытэтнае значэнне набывае індывідуальны падыход.

**– Што для вас з'яўляецца галоўнай узнагародай у працы са студэнтамі?**

– Вынік не заўсёды можна вымераць лічбамі. Гэта так званая інвестыцыя ў «чалавечы капітал», якая прыносіць узнагароду ў некалькіх вымярэннях: назіранне за развіццём, інтэлектуальны рост, эмацыйная ўцягнутасць. Калі адчуваеш дачыненне і пражываеш шлях разам, тады і атрымліваеш матывацыю да новых дасягненняў.

## «ГРАМАДСКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ»



*Юлія Смірнова, дацэнт кафедры сацыяльнай і арганізацыйнай псіхалогіі факультэта філасофіі і сацыяльных навук*

Амаль 26 гадоў прафесійнай дзейнасці Юліі Сяргееўны звязаны з альма-матар. Для яе прэмія стала паказчыкам высокай ацэнкі праведзенай работы, крыніцай новых надзей і планаў. Вылучае, што галоўнае натхненне, калі даводзіцца сумяшчаць актыўную грамадскую дзейнасць з навучальнай нагрузкай, дае цікавасць і любоў да справы, якой яна займаецца, падтрымка калег і блізкіх.

**– Вы старшыня прафбюро ФФСН, узначальваеце камісію па ідэалагічнай і інфармацыйна-аналітычнай рабоце. Якое дасягненне ў грамадскай працы за апошні час выклікае ў вас найбольшы гонар?**

– Галоўны гонар – каманда нашага прафбюро, сіламі якога ў мінулым годзе быў арганізаваны і праведзены цэлы шэраг мерапрыемстваў у новым для факультэта фармаце. Так, мы арганізавалі экскурсійную паездку «Сэрца Палесся» і калядное чаяванне, на якім павіншавалі калег з надыходзячымі святамі. Такія мерапрыемствы садзейнічаюць згуртаванню калектыву, падтрыманню і ўмацаванню спрыяльнага сацыяльна-псіхалагічнага клімату. Плануем паўтарыць гэты вопыт у бягучым годзе і ўпэўнены, што гэта пакладзе пачатак новым добрым традыцыям факультэта.

2026 год знакавы: 105 гадоў спаўняецца Беларускаму прафесійнаму саюзу работнікаў адукацыі і навукі, 105 гадоў з дня заснавання святкуюць БДУ і яго пярвічная прафсаюзная арганізацыя. У планах – праца па інфармацыйным суправаджэнні і арганізацыі ўдзелу членаў прафсаюза ў святочных падзеях.

**– На ваша меркаванне, якая роля жанчыны ў сучасным грамадстве?**

– Мне хацелася б адзначыць жаночы ўклад у развіццё сацыяльнай сферы, асаблівую ролю ў навучанні і выхаванні будучых пакаленняў, захаванні сямейных каштоўнасцяў і ўмацаванні інстытута сям'і, духоўна-маральных асноў беларускага грамадства.

## «АДУКАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ»



*Святлана Захарава, дацэнт кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі БДУ*

Для яе гэтая ўзнагарода з'яўляецца пацвярджэннем высокай значнасці выкладчыцкай працы. Сваю дзейнасць на кафедры сумяшчае з выкладаннем у Ліцэі імя Ф. Э. Дзяржынскага БДУ, дзе вучыць дзяцей рускай мове і літаратуры. Звязаўшы сваё прафесійнае жыццё з БДУ ў 2001 годзе, яна прайшла шлях ад аспіранта да дацэнта кафедры. З 2019 года кіруе вучэбна-метадычным аб'яднаннем настаўнікаў рускай мовы і літаратуры ў ліцэі. Лічыць, што роля жанчыны ў грамадстве нязменная ў часе: умець натхняць на вялікія і малыя справы, падтрымліваць, накіроўваць.

**– Што лічыце вызначальным паказчыкам поспеху педагога вышэйшай школы сёння?**

– Прафесіяналізм – першы крок да поспеху. Нельга спыняцца, трэба ўмець мяняцца, быць не проста ў трэндзе, а прагназаваць развіццё, быць крыху наперадзе, умець бачыць перспектыву.

**– Якія метады дапамагаюць вам знайсці падыход да студэнтаў?**

– Існуе мноства спосабаў прабіцца да розуму і сэрцаў сучасных студэнтаў, але нейкага ўніверсальнага метаду няма. Па-мойму, аднастайнасць – самы вялікі вораг для педагагічнай дзейнасці. Трэба ўмець адчуваць аўдыторыю, быць гнуткім, адаптавацца пад запыты студэнтаў і весці іх за сабой. Асабісты прыклад, напэўна, самы эфектыўны метад навучання і выхавання, але часам добрае пачуццё гумару і аптымізм бываюць больш эфектыўнымі, чым іншыя прыёмы.

**– Быць выкладчыкам – вялікая эмацыйная праца. Што дапамагае захоўваць адданасць справе?**

– Трэба любіць сваю працу, умець бачыць у ёй станоўчыя бакі. Вельмі матывуе, калі даведваешся, што ўчарашнія студэнты ідуць у прафесію і становяцца выдатнымі педагогамі. Яшчэ прыемна бачыць, як яны выкарыстоўваюць у сваёй працы тое, што вывучалі на занятках.

## «ПРАФЕСІЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ»



*Святлана Дубасава, загадчыца інтэрната №5 Студэнцкага гарадка БДУ*

Для яе гэта ацэнка – прызнанне працавітасці і эфектыўнасці. Дзякуючы высокаму ўзроўню эмпатыі, яна па-майстэрску выбудоўвае камунікацыю і кіруе паўсядзённымі працэсамі. Лічыць, што сёння роля жанчыны ў грамадстве шматгранная і дынамічная.

**– Якое ваша дасягненне за апошні час вы лічыце самым вялікім?**

– Стварэнне камфортнай і шчырай атмасферы, значнае паляпшэнне ўмоў пражывання ў інтэрнаце. Наш 5 інтэрнат унікальны ў сваім родзе: 99% жыхароў – замежныя студэнты. Таму патрэбна ўлічваць разнастайнасць культур, рабіць інтэрнат утульным шматнацыянальным домам. Высокія паказчыкі сталі магчымымі дзякуючы падтрымцы кіраўніцтва студэнцкага гарадка ў асобе начальніка Сяргея Дуброўскага, намеснікаў начальніка Сяргея Вальтэрава і Кацярыны Шаранавай.

**– На вашу думку, у чым заключаецца галоўная місія сучаснай жанчыны-прафесіянала ў структуры вядучай ВНУ краіны?**

– На мой погляд, перш за ўсё ў тым, каб, выкарыстоўваючы свае веды, вопыт і ўнікальныя якасці, спрыяць развіццю ўніверсітэта як цэнтра перадавых інавацый і фарміравання высокакваліфікаваных спецыялістаў. Разам з тым уносіць уклад у развіццё грамадства і ўмацоўваць прынцыпы справядлівасці і роўнасці.

**– Ваша пажаданне калегам-жанчынам універсітэта.**

– Хачу сказаць словы падзякі прарэктару па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце ўніверсітэта Ганне Бакун за падтрымку і дабрыню. Усім жанчынам – заставацца выдатнымі, таленавітымі і мэтанакіраванымі. Хай ваша праца цэніцца, а дома чакаюць утульнасць і згода.

**Гутарыла Алена СВІНКО**

УНІВЕРСІТЭТ
20 мая 2026 года, №5 (2309)

# СТУДЭНТ БДУ АТРЫМАЎ ПЕРАМОГУ НА МІЖНАРОДНЫМ ЭТАПЕ «КУБКА РТК»

**Трэцякурснік факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ Станіслаў Шчагляк стаў пераможцам міжнароднага адборачнага этапу спаборніцтваў па робататэхніцы «Кубак РТК: Мінск». Цяпер ён прадставіць Беларусь у фінале прэстыжнага турніру. Хлопец і раней не раз станавіўся ўдзельнікам і прызёрам міжнародных спаборніцтваў па робататэхніцы.**




«Кубак РТК» – гэта маштабныя спаборніцтвы наземных робатаў, якія праходзяць на адмысловым палігоне. Турнір уключае тры ўзроўні складанасці: «Кубак РТК міні», «Кубак РТК» і «Кубак РТК: Вышэйшая ліга». Станіслаў выступаў у апошнім, самым складаным. Гэты этап разлічаны на ўдзел студэнцкіх каманд з 3 чалавек і прадугледжвае распрацоўку аўтаномных робатаў для вырашэння рэальных праблем: вычарпанне прыродных рэсурсаў, пагаршэнне экалогіі, харчовая бяспека, выпрацоўка і захаванне энергіі, пагрозы нацыянальнай бяспецы.

На беларускім этапе ўдзельнікам трэба было запраграмаваць свае мадэлі так, каб яны выяўлялі і ліквідавалі кароткія замыканні пры электролізе медзі на прадпрыемствах. Сёння гэта распаўсюджаная праблема, на вырашэнне якой сыходзіць шмат часу, сіл і рэсурсаў. Робаты павінны аўтаматызаваць працэс і прыбраць людзей са шкоднай зоны.

Упершыню «Кубак РТК» прайшоў у 2013 годзе. З таго часу ў ім паўдзельнічалі больш за 7000 чалавек з краін СНД. Галоўныя мэты спаборніцтваў – падтрымаць таленавітую моладзь, даць ёй абмяняцца вопытам і паказаць, што робататэхніка – гэта цікава.

## «МНЕ ВЕЛЬМІ ПАДАБАЕЦЦА, ШТО МАЯ ПРАЦА СУПАДАЕ З МАІМ ХОБІ»

Станіслаў нарадзіўся і вырас у Мінску. Вучыўся ў 191 школе, потым у 2 гімназіі, затым у Ліцэі імя Ф. Э. Дзяржынскага БДУ. Факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій абраў, таму што там быў самы блізкі да робататэхнікі напрамак ва ўніверсітэце. Таксама, як выпускнік ліцэя, ён мог паступіць без экзаменаў. Цяпер трэцякурснік ужо год працуе ў сферы робататэхнікі.

*– Усё задавальняе, мне вельмі падабаецца, што мая праца супадае з маім хобі,* – кажа ён.

Атрыманыя на спаборніцтвах веды дапамагаюць яму і на працы. Ён прызнаецца, што для яго ідэальная сітуацыя, калі тое, чым ты займаешся для задавальнення, прыносіць яшчэ і грошы.

## «НЕКАТОРЫЯ ДЭТАЛІ КУПЛЯЎ У РЫБАЛОЎНАЙ КРАМЕ»

Робат, з якім Станіслаў перамог, яго ўласная распрацоўка. І хоць да спаборніцтваў дапускаецца каманда да трох чалавек, ён выступаў адзін.

*– Я праектаваў яго з нуля, сам выбіраў камплектуючыя, друкаваў дэталі на 3D-прынтары, збіраў і праграмаваў,* – дзеліцца студэнт.

Першапачаткова ён планаваў выкарыстоўваць шасціколавае шасі, але з-за недахопу кантролераў рухавікоў прыйшлося перайсці на гусенічную схему. Большасць дэталяў робата надрукаваны на 3D-прынтары, які ён раней таксама распрацаваў і пабудаваў сам, на што сышло дзевяць месяцаў. А некаторыя дэталі канструкцыі, як ён сам расказвае, купляліся ў рыбалоўнай краме.

## «КАНКУРЭНТЫ Ў ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ЯШЧЭ ЗБІРАЛІ РОБАТАЎ, А Я ЎЖО ТЭСЦІРАВАЎ»

Падрыхтоўка да спаборніцтваў расцягнулася на некалькі тыдняў. І ўвесь гэты час Станіславу даводзілася сумяшчаць вучобу, працу і стварэнне робата.

*– На праектаванне, зборку і праграмаванне робата сыходзіў увесь вольны ад працы і вучобы час. Я і зараз закрываю даўгі па лабараторных работах, назапашаныя за перыяд падрыхтоўкі,* – прызнаецца пераможца.

Сітуацыю ўскладнялі і пастаўшчыкі дэталяў.

*– Некаторыя камплектуючыя я атрымаў пазней, чым планаваў, таму прыйшлося разбірацца з імі ўжо ў працэсе праграмавання робата,* – тлумачыць студэнт.

На саміх спаборніцтвах галоўнай праблемай сталі перашкоды ў ланцугу сілкавання, створаныя сервапрыводамі. З-за іх гублялася сувязь паміж асноўным камп'ютарам робата і дапаможным мікракантролерам.

*– І ў апаратным, і ў праграмным плане я паспеў рэалізаваць значна менш, чым хацелася б.*

Перарабляць схему ўжо не было часу, і на другой спробе робат нармальна паехаў толькі пад самы канец. Тым не менш гэтага хапіла для перамогі.

Станіслаў ацэньвае ўзровень падрыхтоўкі сапернікаў як нізкі – у першы дзень спаборніцтваў яны яшчэ збіралі сваіх робатаў, у той час як ён ужо тэсціраваў на трасе.

*– Да апошняга дня я не быў упэўнены, што паспею дарабіць робата да спаборніцтваў. Выснову можна зрабіць такую: нельга здавацца, трэба ісці да канца, выкарыстоўваць кожную гадзіну.*

## «УРАЖАННІ СТАНОЎЧЫЯ»

Арганізацыя спаборніцтваў была якасная. Усё было прадумана, палігон працаваў, заданні дакладныя. Аднак адзін момант усё ж выклікаў неразуменне.

*– Спаборніцтвы разлічаны на студэнтаў з вопытам у робататэхніцы, а ў якасці прыза за першае месца далі адукацыйны набор на Arduino для пачаткоўцаў, узроўню сярэдняй школы,* – расказвае ён.

Тым не менш галоўнае – не прыз, а выхад у фінал і магчымасць праверыць свае сілы на больш высокім узроўні.

## «У ФІНАЛЕ РАЗЛІЧВАЦЬ НА СЛАБЫХ САПЕРНІКАЎ НЕ ВАРТА»

Перамога на мінскім этапе адкрывае дарогу ў фінал прэстыжнага турніру. Станіслаў ужо думае над канструкцыяй новага робата і заказаў дадатковую электроніку. У наступным годзе ён таксама плануе працягваць удзел. Настрой сур'ёзны: узровень падрыхтоўкі расійскіх каманд значна вышэйшы, таму што іх гэтыя спаборніцтвы праходзяць ужо не першы год. Разлічваць на слабых канкурэнтаў у фінале, па яго меркаванні, не варта.

*– Асноўная мэта майго ўдзелу – палепшыць свае навыкі, атрымаць новыя веды. Хацелася б заняць прызавое месца ў фінале,* – кажа студэнт.

**Таццяна САВІЦКАЯ**

## НАВІНЫ МІНСКА | БЕЛАРУСІ

На выратавальнай станцыі «Цнянская» ў Мінску плануюць укараніць унікальную праграму штучнага інтэлекту, аналагаў якой няма ў свеце. Эксперымент праводзіцца менавіта тут з-за вялікай папулярнасці лакацыі – на пляжы адначасова збіраюцца да 10 тыс. чалавек. Штучны інтэлект дапаможа выратавальнікам хутчэй рэагаваць на сігналы няшчасця. Праект рэалізуецца сумесна з Паркам высокіх тэхналогій. У наступныя тры месяцы спецыялісты будуць тэсціраваць праграму і напрацоўваць практыку.

У Цэнтральным раёне Мінска будуюць новую веладарожку, якая злучыць сталіцу з Мінскім раёнам і дазволіць веласіпедыстам дабірацца да Мінскага мора. Працягласць усіх веладарожак у раёне цяпер складае 34,6 км, у гэтым годзе дададуць яшчэ 3,6 км. Злучэнне гарадской веладарожкі з раённай арганізуюць пад пуцеправодам на МКАД, завяршыць работы плануецца ў маі.

У Беларусі адсутнічаюць рызыкі распаўсюджвання хантавіруса, паколькі яго ўзбуджальнік не сустракаецца ў Еўропе і Азіі, а яго натуральны пераносчык – даўгахвосты рысавы хамяк – жыве толькі ў краінах Паўднёвай, Цэнтральнай і Паўночнай Амерыкі. Успышка інфекцыі зафіксавана на круізным лайнеры MV Hondius, які ішоў з Аргенціны ў Каба-Вердэ, аднак СААЗ ацэньвае глабальную рызыку як нізкую. Перадача віруса ад чалавека да чалавека магчымая толькі пры вельмі цесным і працяглым кантакце.

Улетку ў Мінску для школьнікаў будуць працаваць 417 выхаваўча-аздараўленчых і спартыўных лагераў з дзённым і кругласутачным знаходжаннем, дзе плануецца прыняць каля 78,5 тыс. дзяцей. Асноўны ўпор зроблены на кругласутачныя загарадныя лагеры, якія змогуць прыняць каля 40 тыс. юных мінчан.

У Мінску сярод вучняў 9–11 класаў прайшоў гарадскі эканамічны конкурс «Finquiz.by.2026», прысвечаны Году беларускай жанчыны. У спаборніцтве ўдзельнічалі 18 каманд, якія адказвалі на пытанні пра ролю жанчын у сусветнай і беларускай эканоміцы. Першае месца заняла каманда сярэдняй школы № 144, другое – гімназіі № 30, трэцяе – школы № 204. Арганізатарамі выступілі Мінскі дзяржаўны палац дзяцей і моладзі, інспекцыя МПЗ па Мінску і Палата падатковых кансультантаў.

23 мая ў «Мінск-Арэне» адбудзецца святочны канцэрт для выпускнікоў 11-х класаў, пачатак – 17:00. Спецыяльным госцем стане расійскі поп- і рэп-выканаўца Лёша Свік, вядомы па хітах «Малиновый свет», «Не вспоминай» і «Плакала». У гэты ж дзень з 10:00 да 11:00 у школах Мінска прагучыць «Апошні званок» для вучняў 9-х і 11-х класаў.

# ЖАНОЧЫ ФУТБОЛ БДУ: ГІСТОРЫЯ СТВАРЭННЯ КАМАНД, ЯСКРАВЫЯ ПАДЗЕІ, ПЕРАМОГІ

**Спорт – неад'емная частка актыўнага і насычанага жыцця БДУ. Сёння летапіс універсітэта налічвае нямала важных спартыўных дасягненняў. Сярод іх адмысловае месца займаюць перамогі жаночых футбольных каманд БДУ. Да Года беларускай жанчыны пра жаночую зборную каманду БДУ па футболе і жаночую каманду «Універсітэт» па міні-футболе распавёў Віталь Валасюк, начальнік дэпартамента развіцця масавага і аматарскага футбола, галоўны трэнер каманд, старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту БДУ.**



**Распавядзіце, калі ласка, як вы пачалі захапляцца футболам?**
Футбол быў у маім жыцці з самага нараджэння. У малодшым узросце я часта быў гледачом футбольных турніраў і спаборніцтваў, дзе браў удзел мой бацька. Цікавасць да футбола нарастала, і я пачаў наведваць заняткі ў спецыялізаванай дзіцячаюнацкай школе алімпійскага рэзерву Бярозы. Ужо тады я адчуваў, што футбол – гэта мая сфера, і мне хацелася ў ёй развівацца. Так я стаў гульцом мясцовай футбольнай каманды. Калі прыйшоў час паступлення ва ўніверсітэт, я абраў БНТУ. У маё жыццё прыйшоў этап вышэйшай адукацыі і далейшага развіцця футбольнай кар'еры. Прайшоўшы мноства адбораў, я стаў гульцом каманды БНТУ і паспяхова выступаў у Вышэйшай лізе чэмпіянату краіны па футзале. Пасля завяршэння вучобы я працягнуў гуляць і за розныя міні-футбольныя каманды: сталічныя «Абсалют» і «Атлант», а таксама «Граніт» (Мікашэвічы) і «Камунальнік» (Бяроза). Увогуле, этап спаборніцкай кар'еры ў маім жыцці быў яскравым, цікавым і насычаным.

**Як склаўся ваш трэнерскі шлях?**
Яшчэ калі я быў гульцом, разумеў, што неабходна задумвацца пра сваю будучыню. Хацелася застацца ў сферы футбола як мага даўжэй, таму тады прыняў рашэнне атрымаць прафесійныя веды і навыкі для працы трэнерам. Адпаведную адукацыю я атрымаў у Інстытуце перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі БДУФК. Цікава, што спачатку мне давялося папрацаваць у БДУ па першай тэхнічнай адукацыі. Так, у 2007 годзе я стаў інжынерамэлектрыкам Галоўнага гаспадарчага ўпраўлення ўніверсітэта. Футбольны матч паміж супрацоўнікамі якраз і дазволіў на практыцы паказаць мае навыкі і ўменні, якія былі заўважаны кіраўніцтвам. Вось тады мне і прапанавалі варыянт сумяшчэння працы ў статусе трэнера-выкладчыка на кафедры фізічнага выхавання і спорту БДУ. І ў хуткім часе, у 2012 годзе, я ўзначаліў жаночую футбольную зборную каманду БДУ. Так пачаўся новы этап у маім жыцці і ў развіцці каманды.

**Як пачалася гісторыя каманд у БДУ?**
У 2010 г. пачынаецца гісторыя жаночай зборнай каманды БДУ па футболе. Тады гэты спорт набыў вялікую папулярнасць, і паўстала неабходнасць стварэння зборнай на базе ўніверсітэта. Чарговы этап у гісторыі каманды пачаўся ў 2012 г., калі я заняў пасаду трэнера. Быў арганізаваны новы трэніровачны працэс. З таго часу трэнерскі склад і спартсменкі разам ідуць да выніку. Прыемна адчуваць, што з кожным годам каманда мацнее, развіваецца і рухаецца наперад.

Новым этапам у развіцці жаночага футбола стала правядзенне чэмпіянату Беларусі па мініфутболе ў 2017 г. Для нас з'явілася магчымасць стварэння ўласнай каманды, якая змагла б выступаць у дадзеным спаборніцтве. З гэтага часу пачалася праца па падборы спартсменак і арганізацыі трэніровачнага працэсу. Такім чынам, у 2018 г. узнікла жаночая каманда «Універсітэт» па мініфутболе. Назва для каманды была абрана невыпадкова. Хацелася падкрэсліць сувязь спартсменак з найстарэйшым вядучым універсітэтам краіны. Падчас далейшых абмеркаванняў будучай назвы ўспомніўся яскравы дызайн газеты «Універсітэт», і не засталося сумневаў, штоназваць каманду трэба менавіта так. У той жа год каманда пачала выступаць і актыўна ўключылася ў спаборніцкі працэс. Праз два сезоны спартсменкі дасягнулі першых высокіх вынікаў: перамога ў Кубку Беларусі па міні-футболе сярод жаночых каманд. Важна адзначыць, што сярод гульцоў ёсць і будучыя абітурыенты БДУ, і студэнты, і выпускнікі. Мы шчыра імкнёмся захоўваць пераемнасць паміж гульцамі. Для каманды лепш, каб атмасфера ў калектыве падтрымлівалася і захоўвалася адналькавай на працягу доўгага часу. Усе спартсменкі знаёмяцца з нашым распарадкам, традыцыямі, правіламі і прывыкаюць да іх. Гэта дазваляе стварыць надзейную апору для каманды.

**Якія этапы падрыхтоўкі ўключае трэніровачны працэс?**
Гэта розныя трэніровачныя заняткі, дзякуючы якім мы рыхтуем спартсменак да спаборніцтваў. Усе заняткі праходзяць на базе навучальна-спартыўнага комплексу «Універсітэцкі» ў БДУ. Штогод падрыхтоўку мы пачынаем са складання трэніровачнага плана, пачынаючы з 1 верасня. Кожны тыднёвы перыяд трэнерскі штаб распісвае мікрацыкл падрыхтоўкі, дзе вызначаецца від заняткаў, дзень трэніроўкі і час. Часцей за ўсё гэта заняткі на футбольным полі, каб навастрыць індывідуальнае майстэрства на полі і групавыя тактычныя дзеянні, трэніроўкі ў трэнажорнай зале, каб умацаваць фізічную форму, заняткі ў басейне, каб аднавіць арганізм пасля высокіх нагрузак. План працы складаецца так, каб да спаборніцтваў каманда падышла на піку сваёй формы. Нягледзячы на высокую нагрузку, імкнёмся арганізаваць трэніровачны працэс так, каб на заняткі футбалісткі прыходзілі з задавальненнем. Трэба адзначыць, што падрыхтоўка ідзе ўвесь год. Нават на вакацыях у летні час мы арганізуем заняткі для падтрымання формы, якія спартсменкі па магчымасці наведваюць.

**Чаму вы надаяце больш за ўсё ўвагі пры падрыхтоўцы да спаборніцтваў?**
Ключавымі момантамі ў працы з'яўляецца стварэнне спрыяльнай атмасферы і сяброўскага мікраклімату. Гэта непасрэдна ўплывае на дасягненне вынікаў у будучыні. Асноўны пасыл, які мы спрабуем данесці, гэта каб спартсменкі пачуваліся максімальна камфортна. У спрыяльных умовах значна лягчэй паказаць усё, на што здольны, і прынесці камандзе поспех. Важнай з'яўляецца індывідуальная праца са спартсменкамі, бо кожная з іх каштоўная і ўнікальная. Імкнёмся, каб кожны гулец каманды давяраў трэнерам і калектыву, каб мы ўсе разам ішлі да нашай агульнай мэты. Лічу важным, каб трэнерскі склад паказваў прыклад спартсменкам у сваёй працы. Упэўнены, што, калі бачыш поўную аддачу з боку трэнераў, падсвядома хочаш адказаць тым жа.

**Як атрымліваецца падтрымліваць камандны дух?**
Камандны дух – гэта сумесная праца трэнерскага складу і гульцоў. Толькі праца разам дазваляе дасягнуць добрага выніку. Для нас вельмі важна пастаянна падтрымліваць сяброўскую сувязь і бадзёрасць духу. Варта сказаць, што важнае месца ў камандзе адведзена працы капітана і лідараў. Напрыклад, падчас матчу трэнер не можа выйсці на поле, у такія моманты вялікую ролю іграе менавіта згуртаванасць каманды. У сваю чаргу трэнеры імкнуцца максімальна падтрымаць спартсменак і накіраваць іх сілы у патрэбнае рэчышча. Рад адзначыць, што з году ў год камандны дух сярод гульцоў толькі мацнее. Новыя гульцы паспяхова ўліваюцца ў атмасферу сяброўства, абароны і падтрымкі.

**Які матч ці спаборніцтва за перыяд вашай трэнерскай кар'еры вы лічыце самым важным?**
Гэта некалькі матчаў. У першую чаргу вельмі важнай стала перамога ва Універсіядзе па футзале ў 2015 годзе. Гэта першы трафей такога высокага ўзроўню жаночай студэнцкай каманды БДУ, які пацвердзіў прафесіяналізм каманды. Наступнай параўнальнай па ўзроўні перамогай стала 1 месца на Кубку Беларусі па міні-футболе ў сезоне 2019–2020 гг. Яскравай падзеяй у гісторыі развіцця жаночай зборнай БДУ па футболе стаў фінал Універсіяды ў 2023 годзе, дзе каманда БДУ абыграла каманду БДУФК з лікам 5:1. У 2026 г. каманда дамаглася сапраўднага трыумфу: выйграла Суперкубак Беларусі, Кубак Беларусі і чэмпіянат рэспублікі па міні-футболе сярод жаночых каманд. Гэта 3 найважнейшыя спаборніцтвы, перамога ў якіх паказвае, што праца вядзецца ў правільным напрамку.

**Ацаніце, калі ласка, узровень развіцця жаночага футбола сёння.**
Выдатна, што ёсць такі спартыўны напрамак. Ён значна пашырае спартыўныя гарызонты і дазваляе ўбачыць новыя таленты. Калі ствараліся жаночая зборная каманда БДУ па футболе і жаночая каманда «Універсітэт» па міні-футболе, было нялёгка. Спатрэбілася шмат часу, каб прышчапіць гульцам псіхалогію пераможцы. У спорт ніхто не прыходзіць проста так, усе перажываюць за вынік. Але, рупліва трэніруючыся з году ў год і фарміруючы згуртаваную каманду, разам у нас атрымалася прыйсці да стабільнага добрага выніку. Сёння жаночы футбол займае важнае месца ў жыцці БДУ і Беларусі. Выразна бачныя тэндэнцыі і павелічэнне колькасці спаборніцтваў, рост колькасці каманд і папулярнасці гэтага віду спорту.

**У чым, на ваш погляд, заключаецца ўнікальнасць жаночых каманд па футболе?**
Я трэнер не толькі жаночых зборных каманд па футболе, але і мужчынскіх, і я дакладна бачу розніцу паміж імі. Варта сказаць, што трэніровачны працэс у каманд падобны. Аднак унікальнасць заключаецца ў псіхалагічнай працы з камандамі. У першую чаргу мы імкнёмся знайсці тонкую грань, каб дасягнуць поўнага даверу і разумення. Важна захоўваць камунікацыю не толькі на трэніроўках і спаборніцтвах, але і за іх межамі. Кожны гулец каманды яскравы і ўнікальны. Таму мы імкнёмся даць магчымасць паказаць сябе ўсім спартсменкам. Захоўваючы іх індывідуальнасць, падтрымліваючы іх упэўненасць у сабе і сваіх сілах, прыводзім каманду да сумеснай працы і згуртаванасці.

**Музей гісторыі БДУ,
кафедра фізічнага выхавання і спорту БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
20 мая 2026 года, №5 (2309)

# АНДРЭЙ НЕСЦЯРОНАК: МАЙСТЭРСТВА ДЫВЕРСІІ

**Напярэдадні Дня Перамогі ў рэдакцыю газеты «Універсітэт» прыйшоў ліст ад сям’і Несцяронкаў. Некалькі яе пакаленняў цесна звязаны з БДУ. У іх ліку не толькі студэнты, але і выкладчыкі нашага ўніверсітэта. У лісце – гісторыя Андрэя Паўлавіча Несцяронка, чыё жыццё стала прыкладам зацятасці і самаадданасці на шляху да Перамогі.**

У нашым сямейным архіве захоўваюцца пажоўклыя дакументы, фатаграфіі, узнагародныя лісты. Яны – маўклівыя сведкі баявога шляху Андрэя Пятровіча Несцяронка. Ён нарадзіўся 17 жніўня 1906 года ў вёсцы Янава Полацкага раёна Віцебскай вобласці. Да вайны працаваў інструктарам аддзела кадраў ЦК КП(б) Беларусі. У Чырвоную армію прызваны ў 1939 годзе, вайсковае званне – старшы тэхнік-лейтэнант. Па спецыяльнасці – ваенны інжынер.

З першых дзён вайны мой прадзед уключыўся ў барацьбу. У ліпені 1941 года яго накіравалі ў распараджэнне НКУС СССР – для арганізацыі партызанскага супраціву. Ён быў прызначаны інструктарам-падрыўніком у адну з першых навучальных структур – Аператыўна-навучальны цэнтр Заходняга фронту, база якога знаходзілася ў Падмаскоўі. Прадзед увайшоў у штат спецыялістаў, якія ў палявых умовах навучалі падрыўной справе першыя дыверсійныя групы, што заходзілі ў тыл ворага.

Улетку 1942 года ствараецца Цэнтральная школа падрыхтоўкі партызанскіх кадраў пры Цэнтральным штабе партызанскага руху, якая рыхтавала камандны склад для партызанскіх атрадаў, радыстаў, дыверсантаў, падрыўнікоў. Андрэй Пятровіч працягнуў сваю дзейнасць у яе структуры, стаўшы адным з вядучых выкладчыкаў і кіраўніком навучальнага працэсу па падрыхтоўцы спецыялістаў мінна-падрыўной справы.

Узімку 1942 года, пасля фарміравання Беларускай школы падрыхтоўкі партызанскіх кадраў пры Беларускім штабе партызанскага руху, Андрэй Пятровіч пачаў рыхтаваць кадры падрыўнікоў на базе абедзвюх школ: чытаў лекцыі, праводзіў трэніроўкі. Інструктар не меў права вучыць тэорыі без баявога досведу. Таму Андрэй Пятровіч сам пераходзіў лінію фронту, правяраў новыя метады падрыву на справе. Навучаючы іншых майстэрству дыверсіі, ён удзельнічаў у самых складаных аперацыях: знішчаў эшалоны на лініях Мінск – Орша, Полацк – Віцебск, падрываў масты. Андрэй Несцяронак рыхтаваў не проста байцоў, а сапраўдных спецыялістаў па аб’ектным мініраванні (падрыў мастоў, заводаў, вадакачак) і працы з мінамі запаволенага дзеяння. Гэта патрабавала глыбокіх інжынерных ведаў.

Увосень 1943 года вынікі гэтай працы сталі відавочныя. Андрэй Пятровіч быў адным з распрацоўшчыкаў і непасрэдных арганізатараў аперацый «Рэйкавая вайна» (жнівень – верасень) і «Канцэрт» (верасень – кастрычнік). Падрыхтаваныя ім кадры склалі касцяк дыверсійных груп, калі за адну ноч выводзіліся з ладу дзясяткі кіламетраў шляхоў. У гэтых аперацыях удзельнічалі 193 партызанскія атрады, было падарвана каля 215 000 рэек.

Перакіданне нямецкіх войскаў і грузаў на ўсходні фронт зменшылася на 40 % – гэта паралізавала забеспячэнне вермахта і стала непасрэдным укладам у поспех наступу Чырвонай арміі. За маштабную падрыхтоўку падрыўнікоў для гэтых аперацый Андрэй Пятровіч быў прадстаўлены да ордэна Чырвонага Сцяга (указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 01.03.1943 г.).

З ліпеня 1941 года ў навучальных цэнтрах, а затым і ў Цэнтральнай школе Андрэй Пятровіч зарэкамендаваў сябе адным з самых паважаных спецыялістаў. Ён навучаў афіцэраў разведаддзелаў дзейных частак Чырвонай арміі. А знаходзячыся ў аператыўным пункце пры 3-й Арміі, асабіста перапраўляў дыверсійныя групы ў тыл ворага на тэрыторыю Палескай вобласці і забяспечваў з імі сувязь.

Ва ўзнагародным лісце да ордэна Чырвонай Зоркі ёсць такая характарыстыка: «Тав. Несцяронак Андрэй Пятровіч з пачатку ваенных дзеянняў самаадддана працуе па падрыхтоўцы партызанскіх кадраў для дыверсійных груп, забеспячэнні іх мінна-падрыўной тэхнікай, перакіданні дыверсійных груп у тыл і наладжванні з імі сувязі».



Ва ўзнагародным лісце да медаля «Партызану Айчыннай вайны» I ступені: «За час працы падрыхтаваў звыш 2500 чал. дыверсійна-партызанскіх кадраў... выявіў выключную настойлівасць, сумленна і верна аддаваў свае сілы на справу падрыхтоўкі кадраў для разбурэння тылу суперніка».

Унёсак Андрэя Пятровіча Несцяронка ў Перамогу – гэта не толькі баявы досвед на франтах вайны, але і створаная ім методыка, якая дазволіла за кароткі тэрмін ператвараць неспрактыкаваных салдатаў у майстроў падрыву. Так неацэнныя веды перадаваліся ад байца да байца, набліжаючы тым самым дзень доўгачаканай Перамогі.

**Арцём НЕСЦЯРОНАК**

# Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб’яўляе конкурс
## на замяшчэнне пасад прафесарска–выкладчыцкага складу

| Найменне пасады | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|
| **Загадчык** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| | [2] Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата медыцынскіх навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| **Прафесар** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| **Дацэнт** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| **Старшы выкладчык** | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў |

**Фізічны факультэт аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступнай пасады:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры камп’ютарнага мадэлявання | 5 гадоў |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 315; да 18 чэрвеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 326; да 18 ліпеня.

[1](дацэнт, прафесар, намеснік загадчыка агульнаўніверсітэцкай кафедры, загадчыка кафедры)

**Факультэт міжнародных адносін аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Прафесар кафедры міжнародных адносін (2) | 1 год |
| Прафесар кафедры міжнародных адносін | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры міжнародных адносін (4) | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры міжнародных адносін | 3 гады |
| Прафесар кафедры міжнародных эканамічных адносін (2) | 1 год |
| Дацэнт кафедры міжнародных эканамічных адносін | 2 гады |
| Дацэнт кафедры міжнародных эканамічных адносін | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры міжнародных эканамічных адносін | 1 год |
| Старшы выкладчык кафедры міжнародных эканамічных адносін (3) | - |
| Дацэнт кафедры міжнароднага турызму і гасціннасці (2) | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры міжнароднага права | 1 год |
| Дацэнт кафедры міжнароднага права | 5 гадоў |
| Старшы выкладчык кафедры міжнароднага права | - |
| Старшы выкладчык кафедры англійскай мовы міжнароднай прафесійнай дзейнасці | - |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Ленінградская, 20, каб. 504; да 18 чэрвеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Ленінградская, 20, каб. 516; да 18 ліпеня.

**Факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі аб’яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры рэгіянальнай геалогіі | 1 год |
| Прафесар кафедры рэгіянальнай геалогіі | 1 год |
| Прафесар кафедры геаграфічнай экалогіі | 3 гады |
| Дацэнт кафедры рэгіянальнай геалогіі | 1 год |
| Старшы выкладчык кафедры фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій | - |
| Выкладчык кафедры фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій | - |
| Выкладчык кафедры агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі | - |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Ленінградская, 16, каб. 314; да 18 чэрвеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Ленінградская, 16, каб. 213; да 18 ліпеня.

**Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі аб’яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Дацэнт кафедры біямедыцынскай інфарматыкі | 1 год |
| Дацэнт кафедры фундаментальнай матэматыкі і інтэлектуальных сістэм | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры матэматычнага мадэлявання і аналізу дадзеных | 1 год |
| Старшы выкладчык кафедры інфармацыйных сістэм кіравання (5) | - |
| Старшы выкладчык кафедры шматпрацэсарных сістэм і сетак (3) | - |
| Старшы выкладчык кафедры тэхналогій праграмавання (2) | - |
| Старшы выкладчык кафедры камп’ютарных тэхналогій і сістэм (2) | - |
| Старшы выкладчык кафедры матэматычнага мадэлявання і аналізу дадзеных | - |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: дэканат факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі (каб. № 431 галоўнага корпуса БДУ, пр. Незалежнасці, 4, г. Мінск); да 18 чэрвеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі (каб. № 440 галоўнага корпуса БДУ, пр. Незалежнасці, 4, г. Мінск); да 18 ліпеня.

**МДЭІ імя А. Д. Сахарава БДУ аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры экалагічнай медыцыны і радыебіялогіі [2] | 5 гадоў |
| Старшы выкладчык кафедры сацыяльна-гуманітарных навук і ўстойлівага развіцця | 5 гадоў |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Даўгабродская, 23, корпус 1, кабінет 202; да 18 чэрвеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: 220070, г. Мінск, вул. Даўгабродская, 23, корпус 1, кабінет 202; да 18 ліпеня.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 20.05.2026 г.
Зак. 352. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
*e-mail: gazeta@bsu.by; gazeta.bsu.by*